ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта
І.П.Шчасны
2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзенні фестывалю-кірмашу «Кераміка Крэва»

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення фестывалю – кірмашу «Кераміка Крэва» (далей – фестываль).

2. Арганізатарамі фестывалю з’яўляюцца: Смаргонскі раённы выканаўчы камітэт, аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры «Смаргонскі раённы цэнтр культуры».

3. Фестываль праводзіцца штогод з мэтай адраджэння, захавання і развіцця ганчарства, аднаго са старажытнейшых мастацкіх рамёстваў Беларусі, падтрымкі і развіцця ганчарнага майстэрства ў розных рэгіёнах Беларусі, удасканальвання прафесійнага майстэрства майстроў – керамістаў і папулярызацыі іх творчасці, паказу дасягненняў у галіне сучаснай керамікі, садзейнічання развіццю сувенірнага рынку, прафесійных сувязей, стварэння ўмоў для творчых зносін, абмену вопытам работы, выкарыстання ганчарнага майстэрства для рэалізацыі сацыяльных праектаў, выхавання культуры керамікі падчас правядзення ганчарнага кірмашу і жывых зносін пакупнікоў і майстроў, далучэння ўсіх жадаючых да працэсу атрымання ганчарных вырабаў шляхам яго дэманстрацыі і непасрэднага ўдзелу ў правядзенні майстар – класаў, эстэтычнага выхавання насельніцтва.

4. Фестываль адбудзецца 9 жніўня 2025г. у аг. Крэва Смаргонскага раёна.

5. У фестывалі прымаюць удзел майстры па кераміцы з розных рэгіёнаў Беларусі, якія працуюць у традыцыях народнага ганчарства. На выстаўку, якая праводзіцца падчас фестывалю, могуць быць прадстаўлены работы, якія маюць характэрныя асаблівасці свайго рэгіёну, а таксама іншыя творчыя работы ганчарнага мастацтва.

6. Праграма фестывалю – кірмашу уключае : урачыстае адкрыццё, майстар – клас па традыцыйным рамёстваў, праца тэматычных пляцовак, канцэртныя праграмы клектываў аматарскай творчасці.

7.Праграма фестывалю ўключае ў сябе 2 конкурсы: «Хатняе заданне» (выраб з гліны на вольную тэматыку) , конкурс на лепшы выраб з гліны на месцы з правядзеннем майстра – класа па дробнай лепцы на керамічны і ганчарны выраб.